

ДУК "Лёзненская ЦБС"
Цэнтральная раённая бібліятэка

# Вайна ў сэрцы, у памяці, у кнігах…

Рэкамендацыйны спіс літаратуры

2021

**Вайна ў сэрцы, у памяці, у кнігах…**: рэкамендацыйны бібліяграфічны спіс літаратуры / ДУК «Лёзненская ЦБС», Цэнтральная раённая бібліятэка; склад. і рэд. А.С. Кажэрава. – Лёзна, 2021. – 11 с.: іл.

У рэкамендацыйны спіс літаратуры ўвайшлі лепшыя кнігі на ваенную тэму з фонду Лёзненскай цэнтральнай раённай бібліятэкі. Гэтыя выданні прызначаны для ўсіх, хто цікавіцца гісторыяй сваёй Радзімы.

Кожная прачытаная кніга аб вайне – гэта асабісты ўклад у захаванне памяці аб гераізме і мужнасці ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны.

# Уступ

У 2021 годзе – знамянальная дата, 80 год з пачатку Вялікай Айчыннай вайны, якая пакінула глыбокі след у памяці беларускага народа і будзе вечна жыць ў сэрцы беларусаў.

Падзеі тых незабыўных дзён з кожным годам аддаляюцца ад нас, але не гасне подзвіг ветэранаў, якія перамаглі фашызм у жорсткай барацьбе. Уявіць гэты подзвіг ва ўсіх дэталях, узнавіць гераічныя і трагічныя старонкі мінулага дапамагае літаратура. Пісьменнікі-франтавікі пісалі пра суровую і трагічную ваенную і пасляваенную рэчаіснасць. Іх творы – праўдзівае сведчанне таго часу, калі Савецкая краіна ваявала і перамагла.

З вышыні дасягненняў беларускай прозы асабліва бачны ідэйна-мастацкія вартасці лепшых твораў Вялікай Айчыннай вайны. Творчыя набыткі пісьменнікаў таго часу абумовілі поспех сучасных празаікаў, якія па агульнаму прызнанню чытачоў і крытыкаў сказалі свае важкае слова пра гераізм народа і тую трагедыю, якую ён перажываў.

Прачытаныя кнігі пра вайну змогуць зачапіць сэрца, дадаць кроплю дабрыні і ўвагі тым, хто прайшоў гэтую вайну, бачыў яе жахі, дапамогуць ўсвядоміць каштоўнасці мірнага жыцця.

# Спіс літаратуры




1. **Адамович, А. Блокадная книга** / А. Адамович, Д. Гранин. – Минск: Мастацкая літаратура, 2015. – 575 с.

*В книге рассказывется о муках осажденного фашистами Ленинграда, о героизме и немыслимых условиях, выпавших на долю его жителей, сумевших в нечеловеческих условиях девятисотдневной блокады сохранить свое достоинство, свой город.*




2. **Адамовіч, А. Хатынская аповесць** / А. Адамовіч. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1989.– 237 с.: іл.

*Гэта кніга прысвечана партызанскаму руху ў Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Аўтар з болем і гневам раскрывае страшэнныя трагедыі тысяч беларускіх вёсак, знішчаных фашыстамі. Гэта аповесць аб нязломнай сіле чалавечага духу, аб гераічным супраціўленні людзей фашысцкім акупантам.*




3. **Адамовіч, А. Я з вогненнай вескі** / А. Адамовіч [і інш.]. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1983. – 439 с.

*Гэта кніга-дакумент, у якой сабраны запісанныя аўтарамі сведчанні ўцалелых жыхароў з сотняў беларускіх вёсак, спаленных фашыстамі разам з людзьмі. У кнігу ўвайшлі ўспаміны толькі тых, якія самі перажылі жудасны лёс сваіх аднавяскоўцаў.*




**4. Алексіевіч, С.А. Апошнія сведкі**: кніга недзіцячых расказаў / С.А. Алексіевіч. – Мінск: Юнацтва, 1985. – 189 с.

*Гэта кніга – своеасаблівая анталогія народнай памяці, яшчэ адно абвінавачванне жорсткасці і бесчалавечнасці фашызму.*




**5. Арабей, Л. Сузор'е Вялікай Мядзведзіцы**: раман / Л. Арабей. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1980. – 431 с.: іл.

*Для фашызму не існавала ніякіх каштоўнасцей, ён нішчыў усё – мастацтва, навуку, хараство, каханне. У рамане паказана, як ва ўмавах Заходняй Беларусі нарастаў пратэст народа супраць фашысцкай акупацыі, як далучаліся да барацьбы ўсё новыя патрыёты, як аб'ядноўвалі свае сілы савецкія і польскія партызаны.*




**6. Брыль, Я. Птушкі і гнёзды:** выбраннае / Я. Брыль. – Мінск: Мастацкая літаратура, 2006.– 463 с. – (Беларуская проза ХХ стагоддзя).

*Аўтар аддаў герою многае з перажытага ім самім: нялёгкае дзяцінства ва ўмовах былой Заходняй Беларусі, службу ў польскай арміі, нямецкі палон, уцёкі і ўдзел у партызанскай барацьбе. Але раман не з'яўляецца аўтабіяграфічным, гэта расказ пра шлях да святла, пра яшчэ адно месца ў страі яго абаронцаў.*




7. **Быкаў, В. Дажыць да світання**: аповесці / В. Быкаў. – Мінск: Юнацтва, 1990. – 494 с.: іл.

*Падзеі першых месяцаў вайны ўваскрашаюцца ў гэтай аповесці. Невялікая група савецкіх воінаў адпраўляецца ў варожы тыл, каб знішчыць нямецкую базу боепрыпасаў. Пры пераходзе лініі фронту гінуць некалькі чалавек, а астатнія прыходзяць на месца, але базы ўжо няма.*




8. **Галіноўская, Н. Няма даравання вайне**: вершы і паэма / Н. Галіноўская. – Мінск: Чатыры чвэрці, 2014. – 66 с. – (Дзеці вайны).

*У кнігу лаўрэата Літаратурнай прэміі імя Я. Маўра, вядомай паэтэсы Ніны Галіноўскай увайшлі вершы і паэма "Пра дзяўчынку Галінку", прысвечаныя падзеям Вялікай Айчыннай вайны. Паэма носіць аўтабіяграфічны характар.*




9. **Зельскі, А.Г. Хатынь. Трагедыя беларускага народа** = Хатынь. Трагедия белорусского народа / А.Г. Зельскі. – 2-е выд. – Мінск: Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2019. – 144 с.: іл. – (Беларусь. Трагедыя і праўда памяці).

*Кніга прысвечана 75-годдзю трагедыі вёскі Хатынь, якая стала для ўсяго свету сімвалам незлічоных ахвяр, пакут і мужнасці беларускага народа ў Другой сусветнай вайне. У кнізе змешчаны гістарычныя звесткі пра Хатынь пачынаючы з 16 стагоддзя, расказ пра трагедыю гэтай і іншых беларускіх вёсак, знішчаных нацыстамі ў Вялікую Айчынную вайну, гісторыя стварэння мемарыяльнага комплексу «Хатынь» і яго падрабязнае апісанне.*




**10. Кремлёв, С. 1941: неизбежный реванш СССР** / С. Кремлёв, М. Мельтюхов, Е. Прудникова. – Москва: Алгоритм, 2017. – 400 с. – (Поле битвы – Россия).

*Предыстория и начало Великой Отечественной войны – тема жесткой дискуссии, развернувшейся в постсоветской России. Отделяя факты от мифов, опираясь на скрупулезное исследование рассекреченных документов тех лет, рассматривая виртуальные варианты военных операций 1941 года, авторы этой книги разъясняют подлинные причины не только наших поражений на первом этапе войны, но и неизбежного реванша СССР.*




**11. Кулаковский, А. Встречи на росстанях**: роман / А. Кулаковский. – Минск: Мастацкая літаратура, 1982. – 352 с.: ил. – (Белорусский роман).

*...Они были еще совсем молоды и только начинали жизнь. Горячо полюбили друг друга, мечтали вместе жить и работать. Но разразилась война, все изменилось. Андрей взял в руки оружие, а Вера эвакуировалась в глубокий тыл. На страницах книги автор рассказывает о том, как сложилась судьба этих людей в годы войны, какие трудности им пришлось преодолеть.*




**12. Леванович, Л.К. Щеглы**: роман, рассказы: пер. с бел. яз. / Л.К. Леванович.– Мінск: Мастацкая літаратура, 2012. – 398 с.

*В центре романа семья фронтовика Матвея Сахуты. Его жена Катерина растит в землянке пятерых детей. Автор показывает своих героев в работе и любви, раскрывает их духовный мир, пытается осмыслить трудное и противоречивое послевоенное время с высоты сегодняшнего дня.*




**13. Лыньков, М. Незабываемые дни**: роман в 4-х кн. / М. Лыньков. – Минск: Беларусь, 1969.– 607 с.: ил. – (Белорусский роман).

*У кнізе паўстае хвалюючы вобраз магутнага народа, які ўзняўся на рашучую барацьбу супраць ворага. Аўтар, працуючы над творам, уважліва вывучаў гістарычны матэрыял, выкарыстоўваў асабістыя расказы многіх удзельнікаў баёў – ад салдат да генералаў. Невыпадкова ў кнізе ёсць гістарычныя асобы, якія дзейнічаюць пад сваімі сапраўднымі імёнамі.*




**14. Навуменка, І. Сасна пры дарозе**: раман/ І. Навуменка. – Мінск: Народная асвета, 1980.– 336 с.: іл.

*“Сасна пры дарозе”, “Ветер в соснах”, “Сорок трэці” – першая ваенная трылогія беларускага пісьменніка Івана Навуменкі.*
*Твор прысвечаны барацьбе савецкага народа супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у гады Вялікай Айчыннай вайны.*




**15. Новиков, И. Руины стреляют в упор**: документальная повесть / И. Новиков. – Минск: Беларусь, 1969. – 435 с.: ил.

*Гэта* аповесць *– помнік тым, хто не пашкадаваў свайго жыцця ў барацьбе за свабоду і незалежнасць нашай Радзімы. Твор расказвае аб гераічнай барацьбе мінскіх падпольшчыкаў, аб іх ролі ў разгортванні партызанскага руху на Беларусі.*




**16. Память бережно храним. Великой Победе посвящается:** для сред. и ст. шк. возраста / сост. О.А. Черепковская. – Минск: Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2020. – 72 с.: ил. – (Белорусская детская энциклопедия).

*В иллюстрированной энциклопедии рассказывается о наиболее запоминающихся памятниках и мемориальных комплексах Беларуси, о героях-защитниках и освободителях Родины, о Белорусском государственном музее истории Великой Отечественной войны. В книге также помещены произведения белорусских художников на военно-патриотическую тематику.*




**17. Па праву жывога:** кніга-прызнанне сучасных беларускіх паэтаў да 70-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў / склад. Т.Ф. Рослік.– Мінск: Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2014. – 472 с.

*Ніхто не забыты, ніщто не забыта – гэтыя словы гавораць аб тым, што гераічнае мінулае нашай краіны навекі застанецца ў народнай памяці.*




**18. Рубцов, Ю.В. Потаенные страницы Великой Отечественной войны** / Ю.В. Рубцов. – Москва: Вече, 2018. – 416 с.: ил. – (Военные тайны XX века).

*В книге Ю. Рубцова рассказывается о репрессиях в Красной армии накануне войны и в самом ее начале; доказывается, что факта измены на Западном фронте в начале войны не было; показывается роль заградительных отрядов и организация партизанского движения в тылу врага.*




19. **Рунов, В.А. 1941. На пороге войны** / В.А. Рунов. – Москва: Вече, 2018. – 448 с.: ил. – (Военные тайны XX века).

*Трагедия 1941 года… Ее предпосылки, причины и последствия описывает в своей новой книге известный российский историк В.А. Рунов. Используя архивные документы, воспоминания участников и другие публикации, автор рассматривает основные вопросы подготовки ведущих мировых правительств – Германии и СССР к Великой Отечественной войне.*




20. **Савіцкій, А. Літасці не чакай**: раман/ А. Савіцкій. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1982.– 398 с.: іл.

*Аўтар малюе шырокае палатно партызанскага руху рэспублікі ў гады Айчыннай вайны, паказвае мужнасць савецкіх людзей у барацьбе за незалежнасць бацькаўшчыны. Гэты раман пра тых, хто аддаў жыццё за шчасце і свабоду Радзімы, хто змагаўся і перамог.*




21. **Сачанка, Б. Вялікі лес**: раман у 3-х кн./ Б. Сачанка. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1980. – 984 с.

*У аснову рамана пакладзены падзеі, што адбываліся на Палессі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Апавядаецца пра тых, хто вядзе арганізаваную барацьбу з захопнікамі, пра лёс аднавяскоўцаў, пра арганізатараў і кіраўнікоў партызанскага руху на Палессі, пра тых, хто не схіліў галаву перад ворагам.*




**22. Чыгрынаў, І. Плач перапёлкі**: раман / І. Чыгрынаў. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1984. – 367 с.

*“Плач перапелкі”, “Апраўданне крыві”, “Свае і чужынцы”, “Вяртанне да віны” – трылогія, у якой паказан пачатак Вялікай Айчыннай вайны, першыя яе месяцы. Аўтар паказвае, як няпроста было разабрацца ў тым, што адбывалася, у якіх складаных умовах фашысцкага тэрору і правакацый пачыналі сваю дзейнасць падпольшчыкі і першыя партызанскія групы.*




**23. Шамякин, И. Возьму твою боль**: роман/ И. Шамякин. – Москва: Советский писатель, 1980. – 383 с.

*Галоўны герой рамана Іван Батрак, дзяцінства якога прыйшлося на цяжкія гады Вялікай Айчыннай вайны, заняты мірнай працай хлебароба. Але вяртанне ў вёску былога паліцая, які ўдзельнічаў у расстрэле маці Івана, разварушыла боль, памяць аб мінулым...*




**24. Шамякин, И. Сердце на ладони**: роман/ И. Шамякин. – Минск: Мастацкая литаратура, 2001. – 414 с.

*У рамане ўзнімаюцца праблемы грамадзянскай адказнасці чалавека перад самім сабой, народам, гісторыя. Драматызм твора застаўляе чытача задумацца над урокамі вайны.*



Складальнік і рэдактар А.С. Кажэрава


**Наш адрас:**

г.п. Лёзна, вул. Леніна, 65

**тэл.:** 5-17-54, 5-17-67

**E-mail:** libliozno@rambler.ru

**Web-сайт:** libliozno.of.by


немецким оккупантам!